УДК 821.161.3

Мастацкая канцэпцыя вайны-кантынуума ў творчасці Ц. Гартнага

Артыкул прысвечаны комплекснаму аналізу прозы і паэзіі Ц. Гартнага, звязаных з увасабленнем падзей Першай сусветнай, што паўсталі ў шэрагу іншых грамадска-палітычных працэсаў пачатку XX ст. Нягледзячы на тое, што пісьменнік у ідэалагічна правільным рэчышчы падаваў вайну 1914 – 1918 гг. як імперыялістычную бойню, чужую для пралетара і селяніна, ён імкнуўся да адносна аб'ектыўнага адлюстравання гэтага гістарычнага перыяду. Стэрэатыпнае ўвайшло ў складаны і супярэчлівы дыялог з унікальнымі аповедамі пра адметныя з'явы Першай сусветнай. Аўтар апеляваў да матыву вайна / навала-кантынуум, каб падкрэсліць крызісны характар эпохі, што рухалася да рэвалюцыі 1917 г. Ц. Гартны правёў паралелі паміж татальнай вайной і працай канвеера, які з механістычнай абыякавасцю перапрацоўваў чалавечыя жыцці на фронце, у шпіталі ці тыле.

Ключавыя словы: Першая сусветная вайна, літаратура пра вайну, Ц. Гартны, матывы вайна-кантынуум, вайна-праца

The article is devoted to a comprehensive analysis of T.Hartny's prose and poetry, related to the embodiment of the First World War events, which arose in the context of other social and political processes at the beginning of the 20th century. Despite the fact that the writer presented the 1914 – 1918 war in an ideologically correct way (as an imperialistic slaughterhouse alien to the proletarian and the peasant), he strove for a relatively objective depiction of this historical period. The stereotypic entered into a complex and contradictory dialogue with the unique stories about the distinctive phenomena of the First World War. The author appealed to the continuous war motif emphasizing the crisis-like character of the era leading to the revolution of 1917. T. Hartny drew parallels between the total war and the work of an assembly line, which processed human lives with mechanistic indifference at the front, in a hospital or in the rear.

Key words: World War I, war literature, T. Hartny, continuous war motif, motif of war as labour

Першая сусветная вайна як феномен гістарычнай памяці народа і асабістай біяграфіі літаратара мела адмысловую актуальнасць нават у часы, калі падзеі 1914 – 18 гг. на афіцыйным узроўні інтэпрэтаваліся выключна як пярэдадзень рэвалюцыі 1917 г., а ў савецкім літаратуразнаўстве 1920 – 30-х гг. яна разглядалася дастаткова аднамерна. З. Жылуновіч, пішучы ў 1927 г. артыкул «Беларуская літаратура і 10 год кастрычнікавае рэвалюцыі», падкрэсліў: «зрэдку, у хвілі роздумаў, тыя з беларускіх пісьменнікаў і песьняроў, што мелі мажлівасць спыніцца на падзеях, падумаць над імі, скупымі радкамі вылівалі жальбу на лёс свае краіны. Але для чытача гэтыя радкі былі недаступны – іх ня было дзе друкаваць» [1, с. 197]. Агульная выснова пра лёс твораў на тэму Першай сусветнай выглядала стэрэатыпна: «але мажлівага быць пры іншых варунках водгуку на імпэрыялістычную вайну беларуская літаратура не дала» [1, с. 197]. Між тым, аўтар гэтых радкоў увасобіў падзеі 1914 – 18 гг. у вершы «Уцекачы», апавяданнях «Загадзе», «На руінах», «Чырвонаармеец Панкел Ліпа», «Чарговы запіс (Дзённік-нататкі Антона Дзежкі)», рамане «Сокі цаліны».

Айчынныя крытыка і літаратуразнаўства аператыўна звярнуліся да разгляду твораў Ц. Гартнага на тэму Першай сусветнай вайны. Ужо ў 1919 г. у артыкуле «Згукі сусьветнай вайны 1914 – 1918 году у Беларускай паэзіі» Ю. Ф-ко цытуецца верш Ц. Гартнага «Уцекачы» [2]. М. Гарэцкі ў артыкуле «Беларуская літаратура пасля "Нашае Нівы"» дастаткова крытычна паставіўся да плёну працы аўтара ў час вайны: «Што да Цішкі Гартнага, дык ён тады быў яшчэ надта нязначнаю вялічынёю ў беларускай літаратуры; яго настрой у часе крывавых баёў увосень 1914 г. відаць хоць-бы з напісанага ім тады вершу "Капыль", які, аднак, быў надрукованы значна пазьней (гл. – "Вольная Беларусь", № 22 за 1917 г.); тут звычайны нацыянал-адраджанізм, зьбітыя паўторы і нават неасьцярожны гэтым часам наўпамін беларусам <…> аб павіннасьці "сьмела ў час прызыву свой родны край абараняць"» [3, с. 77]. Сам пісьменнік, робячы нарыс «Беларускі Парнас у новай вопратцы», палічыў неабходным звярнуцца да верша «Уцекачы»: «Цішку Гартнага скаланула зьявішча сходу з свае зямлі дзесяткаў тысяч працоўнага народу <…> Паэта праклінае вайну, але верыць, што яна не загубіць яго краю» [4, с. 71].

Верш «Уцекачы», датаваны 1916 г., – першая спроба Ц. Гартнага ўвасобіць праявы сусветнай вайны, якую аўтар прыпадобніў да віхора: «Перайшоу-перабег над старонкай маей // Нябывалы дауно, нячуваны віхор, // І заліу, як вадой, зямлю сльозкай з вачэй // І спугнуу-страсянуу болью

нутрыны гор» [5, с. 2]. Паказальна, што паэт з усёй размаітасці праяў той вайны абраў феномен бежанства, якое набыло сапраўды татальны характар: «І сюды, і туды, удаужкі, упапярок – // Ад зямлі да нябьос – льоскат дробных кальос // Цяжкі енк атдае ад зямлі да аблок» [5, с. 2]. Ц. Гартны выводзіць на першы план адчуванне татальнасці наслання, падкрэслівае, што ў сучасных яму ўмовах уцёкі ад вайны пачалі нагадваць вялікае перасяленне народаў. Паэт спалучае адносна нейтральныя разважанні з поўнымі натуралістычнай дэталізацыі выказваннямі: «І людзей, і жывьол, як на небе тых хмар, // Што пусціу пагуляць разгнявіушыся бог. // На людзях адабіт дзякім выглядам страх // Крокам спугным, які ў пуць няверны жане, // Кроу застыла с пяском на мазольных нагах // Адраньцвела істота у пякельнум агне» [5, с. 2]. З асаблівым пачуццём Ц. Гартны апявае даваеннае жыццё чалавека на радзіме, што ўспрымаецца як гвалтоўна абарваны «залаты час»: «Там ні хаты адны – там і гумны стаяць, // Паміж хатак садкі, за гуменцамі луг; // А шчэ далей, за луг, – там дубровы наукруг // Апікаюць наукол, як вянком сянажаць» [5, с. 2]. Паэт падкрэслівае жахлівасць ідэі сыходу з родных мест, якое мае на ўвазе не толькі развітанне са звыклым пейзажам, але і з дзяцінства засвоеным ладам жыцця, відамі дзейнасці, якія сфармавалі светапогляд селяніна: «Хто хацеу, хто чакау, каму трэба было // Зварушыць, скалыхнуць хлябаробау спакой? // Каб жыцьцьо наусягды ад яго адняло // Чым дарожыць у жыцьці йон, чым цешыцца той» [5, с. 3]. Нягледзячы на ўвасабленне адной з самых трагічных старонак у гісторыі сусветнай вайны, Ц. Гартны не страціў пачуцця сацыяльнага аптымізму: «Працярпелі усяго – мусім далей цярпець – // Толькі з вераю ужо, што калісь будзім мець // Долю шчасную й жыцьцё пауное красы» [5, с. 3].

Аднак, такім надзеям не было наканавана спраўдзіцца. Ужо ў апавяданні «Загадзе» (1920, надрукавана пад псеўданімам Я. Чырвань) аўтар адзначыў: «Вёска Падлужэ ўжо боляй чатырох гадоў, як мяжуе з пазіцыяй <…> Два с паловаю гады даносіліся да яе грукі гармат с пазыцыі царскае вайны, тапталі летам паля палкі царскае пехоты і табуны конніцы. Але вось ужо скора два гады, як бурлоча новая вайна – грамадзянская вайна работнікаў і сялян з белагвардзейцамі» [6, с. 3]. У 1920 г. свет пабачыла апавяданне «Чырвонаармеец Панкел Ліпа», якое мае перазовы са згаданым вышэй творам. Персанаж-шараговец і Першай сусветнай, і Грамадзянскай вайны скрушна разважаў пра ненатуральную, паводле яго меркаванняў, працягласць баявых дзеянняў: «Вайна і вайна! Канчатку ёй, заклятай, ніякага няма. Толечкі вярнуўся з фронту раненым, пакалечаным <…> ні дадому, ні да сваіх, а ў шпіталь, халодны брудны, бездаглядны мур <…> І вось, яшчэ нават як след не ачуняў, а тут, глядзіш, ізноў збірайся на фронт <…> восьмы год я ўсё гэтак вандрую: то на фронт, то назад у шпіталь» [7, с. 477 – 478]. Галоўны герой апавядання «На руінах» вылучыў важкія элементы навалы-кантынуума, якія адбіліся на яго жыцці: «перад ім прамігнулі: царская вайна з усімі сваімі страхамі, першая і другая рэвалюцыі, паўстанцкія атрады, вайна з Калчаком, Дзянікіным, Юдэнічам і, урэшце, з Врангелем» [8, с. 6]. Вынікам такога шэрагу разбуральных падзей, на думку Ц. Гартнага, стала татальнае эканамічнае руйнаванне краіны: «зьнішчылі, агалілі край уканец. Як ток зрабілі. Каб тут і колькі было ўсякага дабра, дык выкрадуць, выхапаюць. Жарты – цэлых шэсць гадоў нішчаць – то і зямлю можна раскрасьці ўсю. Адзін прыдзе – бярэ сабе, сьцяпае, другі прыдзе – бярэ далей і вязе к сябе, трэці і дзесяты – бяруць і бяруць» [8, с. 18]. Заўважым, што з гэтых твораў пісьменнік распачынае распрацоўку аднаго са скразных для яго ваеннай прозы матыву: вайны-кантынуума. Стала гэты матыў распрацаваны ў апавяданні «Чарговы запіс (Дзённік-нататкі Антона Дзежкі)» і рамане «Сокі цаліны».

У апавяданні «Чарговы запіс» падзеі Першай сусветнай падазены як адзін з канцэптуальна значных момантаў у біяграфіі пралетара Антона Дзежкі, які напрацягу жыцця спасцігаў камуністычную ідэалогію. Паводле Ц. Гартнага, першы раз Дзежка-цывільны сутыкаецца з праявамі вайны напрыканцы 1903 г. – у час руска-японскага ўзброенага супрацьстаяння. Апавядаючы пра пачатак канфлікта, аўтар згадвае тагачасную мабілізацыю: «Мястэчка перапоўнена запаснымі, апалчэнцамі. Плач, песьні – усё зьмяшалася ў адну кучу. Тысячы здаровых мужчын адрываюцца ад родных хат і накіроўваюцца за тысячы вёрстаў <…> Мястэчка апяразана жалезным поясам енкаў і прычатаў» [9, с. 48]. Самым драматычным для персанажа момантам стала сітуацыя з гіпатэтычным прызывам у войска: «Забяруць, вымуштруюць на скорую руку і папруць у Манчжуру. Бяда! Зьбёдуюць, як шкелка … Думак і плянаў поўная галава. Няўжо такі паслухаць Шлёмы і ўцячы ў Амэрыку? Але дзе-ж узяць грошы? … Што будзе, тое будзе, – астануся тут. А глядзі, што і забракуюць. Я маю навошта скардзіцца: правая нага не зажыла ад удару з часу, калі я скінуўся з даху» [9, с. 49]. Індывідуальнае выпадковае і часовае збавенне ад навалы не мела на ўвазе разумення яе межаў. Далейшае выпрабаванне для Дзежкі і яго суачыннікаў палягала ў рэвалюцыйных падзеях 1905 г. і іх доўгатэрміновых наступствах.

Непасрэдныя назіранні за падзеямі Першай сусветнай вайны пададзены Ц. Гартным у запісах Дзежкі, якія датуюцца жніўнем 1914 г. Больш-менш разгорнутыя высновы паводле новай праявы навалы-кантынуума прыпадаюць на снежань 1914 г.: «Вайна захапіла ўсіх нас, уцягнуўшы ў абслугоўваньне яе патрэб … Цікава, колькі гэта працягнецца! Нешта не збываюцца самалісьлівыя прароцтвы патрыётаў аб хуткім разгроме немцаў. Самаўпэўненасьць абяртаецца ў разуверра … Дубовыя ілбы! Не навучыліся на “макаках” і з тымі-ж настроямі адносяцца і да “тэўтонаў”» [9, с. 70]. Ужо зімой 1915 г. персанажа твора пачалі хваляваць праблемы, непасрэдна звязаныя з яго малой радзімай: «Мінск набліжаецца да фронту <…> Скуткі вайны займаюць усе думкі і настроі. Узрокі не адрываюцца ад фронту <…> Вакола патыхае вайною. Менск, як у жалезным абручу. Перапоўнены ваеншчынай … Штабы, лазарэты … Усё жыцьцё перавярнулася ўверх дном» [9, с. 70]. Пазнейшыя запісы за той жа год прысвечаны яшчэ адной надзённай тэме часоў Першай сусветнай, якая стала скразной у творах Ц. Гартнага. Аўтар адзначае: «ужо другое лета, як усе дарогі забіты імі [бежанцамі. – З.Т.] дашчэнту. Тысячы і сотні тысяч мірных жыхароў пусьціліся на ўцёкі ад жахаў вайны, растаптаўшай іх гаспадарку, іх хаты, іх жыцьцё. Летась ехалі дальнія, а сёлета з раньняе вясны, рушылі тыя, да якіх наблізіўся фронт і казацкія нагайкі. Як пажар у прэрыях, які гоніць перад сабою спуджаныя стады зьвяроў, вайна тое робіць з людзьмі. Фронт пасуваецца <…>, сеючы пошасьці і сьмерць, апанаваў ні ў чым непавіннае насельніцтва» [9, с. 71]. Далейшыя назіранні за ваеннымі падзеямі пераходзілі ў аналіз надзённых грамадска-палітычных працэсаў: «Другі год вайны, якая цягне за сабою поўны разлад гаспадарскага жыцьця, дарагоўлю і нямерную заблутанасьць ва ўсім становішчы – робіцца адваротнай, надаедлівай і шкоднай <…> Крывадушнымі зычаць воклічы аб дапамозе салдату ў акопах … Бо побач з гэтым ідзе спекуляцыя на пачуцьцях, крадзёж казённага дабра, мільённыя заробкі на пастаўках абутку з папяровай падэшваю, нікуды нягоднага адзеньня» [9, с. 72]. Вынікам такіх змен павінны былі стаць далейшыя радыкальныя трансфармацыі: «вайна імпэрыялістычная цягне за сабою вайну грамадзянскую» [9, с. 72]. Далейшыя запісы, паводле задумы Ц. Гартнага, паступова адцягваюць увагу чытача ад сусветнай вайны, акцэнтуючыся на плыні рэвалюцыі: «Расія ахоплена электрычнаю напружанасьцю. Кожны чалавек да таго стаў чулым, па яго настрою, як па стрэлцы сэйсмографу, можна заключыць аб грамадзянскіх штуршках … Мільёны ўзрокаў накіраваны ў бок Пецярбургу, цалкам занядбаўшы фронтам» [9, с. 74]. Такім чынам, Першая сусветная адыходіць на перыферыю ўвагі, саступаючы месца іншым актуальным праявам навалы-кантынуума.

На фоне прозы першай трэці XX ст., у якой рэалізавана тэма вайны 1914 – 1918 гг., раман «Сокі цаліны» Ц. Гартнага вылучаўся імкненнем да комплекснага разгляду феномена вайны: яе ўплывы аўтар асэнсаваў у жыцці беларускай вёскі ці мястэчка, прыфрантавога Мінска, рабочага Пецярбурга, далёкай Нямеччыны. Айчынныя даследчыкі, аналізуючы літаратурны працэс 1920 – 30-х гг., адзначалі, што гэта кніга – «першы завершаны сацыяльна-бытавы эпічны твор у нацыянальнай літаратуры» [10, с. 17]. Падкрэслівалася адмысловасць постаці галоўнага героя, і адначасова крытыкаваўся яго аўтар, які, «паказваючы некаторыя рысы новага чалавека, не змог яшчэ стварыць яркі і жывы вобраз рабочага ва ўсёй глыбіні і складанасці яго характару» [11, с. 19 – 20]. У беларускім савецкім літаратуразнаўстве раман разглядаўся пераважна як твор, прысвечаны фармаванню рэвалюцыйнай свядомасці Нязвычнага. Дзякуючы такому сюжэту кніга айчыннага аўтара карэлявала з шэрагам знанай савецкай класікі: «закончана была праца над “Сокамі цаліны” тады, калі з’явіліся творы “Справа Артамонавых” М. Горкага, “Жалезны паток” А. Серафімовіча, “Разгром” А. Фадзеева, “Цэмент” Ф. Гладкова, першыя кнігі “Ціхага Дона” М. Шолахава і “Блукання па пакутах” А. Талстога» [12, с. 268]. Вопыт беларускага пісьменніка дапасаваўся да патрэб часу, а «мастацкую эстафету Гартнага падхапілі <…> Р. Мурашка, М. Лынькоў, Б. Мікуліч, Хв. Шынклер» [13, с. 376].

Ц. Гартны ў рамане «Сокі цаліны» прыняў храналогію вайны за аснову для адлюстравання знешняй навалы. У дзвюх частках пададзены моманты ад выспявання грамадска-палітычнага выбуху ў 1914 г. да зараджэння пратэстнага руху напрыканцы 1915 г. у Расійскай імперыі. Нягледзячы на тое, што аўтар падпарадкаваў аповед увасабленню падзей, якія набліжалі 1917 год, ён здолеў занатаваць унікальныя праявы глабальнай вайны.

Матыў повязі вайны з прыроднай стыхіяй адчуваецца ў эпізодах, прысвечаных лету 1914 г. Ц. Гартны параўнаў надыходзячы гістарычны выбух з пажарам, на які дзьме вецер, а «полымя шугае ў бакі і ўгору, шырыцца, расце» [14, с. 122]. Пісьменнік акцэнтаваў увагу на легкадумнасці, з якой недасведчаны сведка чакаў яго надыходу. Пазней, апавядаючы пра пачатак 1915 г., аўтар надаў гэтай аналогіі адмысловы «формульны» выгляд: «Стыхія – вайна» [14, с. 255]. Непрадказальны характар гэтай стыхіі занатаваны ў наступных радках: «нямецкая армія націскае – расійская

адступае, ці наадварот – а мірныя вёскі і мястэчкі няшчадна расціскаюцца пад тоўстымі шынамі гармат, пад конскімі капытамі, пад абцасамі тысячных грамад пехацінцаў» [14, с. 282]. У такой сітуацыі і вайсковец, і цывільны, які трапіў у франтавую пастку, адчувалі сябе «мэрам іх засадзілі ў сталёвы кацёл і грукаюць па ім малатамі. У зацяжным, надрыўным гуку тонуць усякія жаданні і расплываецца сэнс жыцця» [14, с. 398 – 399].

Ц. Гартны распрацаваў тэму дзеяння цывільна-тылавога канвеера забойста, угрунтаванага на «наладжаным гатаванні снарадаў на патрэбу вайны <…> У кожным снарадзе – смерць некалькіх чалавек, разбурэнне, пажары» [14, с. 138]. Калі «апаратная» частка вайны існавала дзякуючы шараговаму чалавеку, які вырабляў зброю на заводзе («кузні людское згубы» [14, с. 191]) ці забяспечваў армію неабходным, то ідэалогія барацьбы буяла дзякуючы дзейнасці дыпламатаў ды палітыкаў, меркаванням эліты. Ц. Гартны спыніўся на агучаным аматарамі вайны: «паясліся задзёрыстыя выгукі наконт закідання шапкамі “працiўнае немчуры” <…> Генералы і задзірыстае афіцэрства <…> замарыла ордэнаў, нагарод, ганаровых званняў. Чарнасотніцкія паўзуны ўзняліся думкамі пра “славу ды перамогу расійскага самаўладства” <…>, лiбералы зараз выкінулі лозунг міжнацыянальнага яднання ў змаганні з “юнкерствам”, “прускай ваеншчынай”, “тэўтонамі”» [14, с. 143].

Для шараговага персанажа вайна-праца пачалася з мабілізацыі. З аднаго боку, Ц. Гартны ўвасобіў імперскі маштаб падзеі: «Кідай, рабочы, кватэру ды сям’ю, селянін, – саху ды каня, разлучайцеся з сям’ёю і нясеце свае галовы на алтар бацькаўшчыны» [14, с. 144]. З другога, празаік звярнуўся да прыватнага малюнка мабілізацыі ў Смагіне: «у адзін дзень усё жыццё мястэчка <…> было сабрана, зліта ў адно месца <…>. І мужчыны, і кабеты, і старыя, і малыя <…> мітусіліся – мэрам бы бачачы занесены над сабою востры, бліскучы нож ката» [14, с. 150]. Энергія адмаўлення вайны прарывалася ў свет: адусюль даносіліся «лебядзіныя песні здаровых, поўных жыцця людзей – на дарозе да бойні» [14, с. 151]. Ц. Гартны тэндэнцыйна апявае мабілізаванага (пазней асноўную сілу рэвалюцыі), бо часцей беларускія пісьменнікі занатоўвалі зніжаныя праявы чалавечай прыроды ў ваенны час (аповесці «На чырвоных лядах» М. Лынькова і «Набліжэнне» З. Бядулі).

Вайна-праца, на думку Ц. Гартнага, адпрэчыла звыклыя віды дзейнасці, таму «незлічоны лік гадзінных адзінак часу кідаліся ў бяздонную процьму, на марнатраўства, на згубу жывых людзей» [14, с. 188]. Рух канвеера разбурэння адбіваўся на быцці сялянскай грамады і жыхароў мястэчак ды гарадоў. Вёска імкнулася да заняпаду: «выходзілі з двара апалчэнцы ды ратнікі, а за імі коні, гаваяда, збожжа <…> Казачная, зданёвая вужака-вайна высмоктвала сокі вёскі» [14, с. 188]. Затое горад ператварыўся ў бурлівы кацёл, дзе квітнела махлярства: «шалёна несліся ўгару акцыі фабрык і заводаў <…> Шпарчэй завярцеліся аперацыі банкаў <…> Гандляры мясам, абуткам, збожжам <…> пашыралі і без таго ўёмныя кішэні для лёгкага заробку» [14, с. 188 – 189].

У прыфрантавых і тылавых гарадах квітнеў адносна новы від працы: «лазарэты і шпіталі вырасталі, як грыбы, перш паўнейшыя клопатамі ды дбайнасцю, а што далей – чарсцвейшыя» [14, с. 190]. Татальны канфлікт прыводзіў да незлічоных ахвяр, таму шпіталі захлыналіся ад чалавечай масы, якая не персаніфікавалася.

Шпітальны канвеер прымаў фантасмагарычныя формы, прыпадабняўся ці то да агляду грэшнікаў у пекле (матыў макабр), ці то да параду па-вар’яцку скліканага вайсковага злучэння: «Вось тонкатвары <…> жывы і, напэўна, весяльчак, сібірак. Маньчжурская шапка паглынае ў сабе страхі нечуваных боляў <…> Следам – чарнявы, задуменны яўрэй – без рукі і нагі <…> Прыплюшчаныя вочы – пэўна, ловяць жахлівыя ўчынкі казакаў <…> Ах, і казак <…> бацька і муж. Аброслы, замурзаны раскапанаю на акопы зямлёю; скрыўлены сударагамі твар; жмак марлі на галаве <…> Саракавы – лязгін <…> У даўгім носе – арліная воля. У раскрытых вачах – водбліск вечных снягоў Казбека <…> Сорак першы – льняны магілёвец <…> Без абедзвюх ног <…> без тых намардаваных ног, што так вёртка спраўляліся з носкаю дроў <…> І на вайне і раней у палку – разам з ім – палтавец» [14, с. 220 – 221]. У такой канцэнтрацыі пакут цяжка вылучыць адну трагедыю, але Ц. Гартны імкнуўся персаніфікаваць пакутнікаў ваеннага часу.

Франтавікі, жыхары прыфрантавых тэрыторый, цывільныя ў тыле заўважалі, што вайна-праца выходзіла з-пад кантролю. Адным з трагічных момантаў быў перыяд, калі сялянства кіравалася ў выгнанне. У працытаваным ніжэй урыўку падкрэслена, як пакутна чалавек працы прызвычайваўся да абставін: «І жыта, і ячмень, хлеб і аладка – усё, усё – назадзе. Адвернешся <…> і няма сілы адарваць ваччу, прыкоўвае болем і жудою, заве, вабіць назад. Назад – да вядомага, да пратупанага, да перамацанага <…> Ды назад нельга» [14, с. 264]. Асаблівы жах апаноўваў і саміх бежанцаў, і тых, хто назіраў за іх падарожжам у невядомае, калі яны сутыкаліся з масавай смерцю, выкліканай стомай і інфекцыйнымі захворваннямі: «А тыфус <…>, а халера <…> як

на пакосе. Людзі – як мухі. Мэрам чыясьці рука махала востраю касою – на вачах клаліся людзі. Зрабіў два крокі – і смерць, два крокі – і смерць. Каня, карову – убок, а чалавека – рыеш магілу. Паложыш і галінку бярозы ці елачку ваткнеш ды далей. Зрэдку саб'еш нетрывалы крыжык. А разам, паверыш, могілкі. На гоны, на вёрсты, доўгія, вялікія могілкі» [14, с. 264].

Вынікі навалы кідаліся ў вочы, бо «вайна – і ворагу пустыя абшары. Вайна – пляваць на ўсе скаргі, на ўсе законы да аховы чалавека, жывёлы, дабра» [14, с. 267]. Грамадства, на думку Ц. Гартнага, спрабавала апраўдваць удзел у працы-бойні і дыскрэдытаваць тую ж бойню, здзейсненую ворагам, але з цягам часу крытыка антаганіста выглядала ўсё больш ненатуральнай: «Атрутныя газы – праступак? Абстрэл Рэймскага сабора – зверства? Зруйнаванне Лувена і Льежа – варварства? А здзекі і глум над тысячамі польскага, беларускага, яўрэйскага, літоўскага працоўнага насельніцтва – тактыка? Гвалтоўнае спусташэнне краю, адданне соцень тысяч людзей у ахвяру бядзе, марозам, тыфусу і галоднай смерці – абарона?» [14, с. 267]. Прынесенае вайной гора немагчыма было пакласці на адны вагі з геапалітычнымі амбіцыямі.

Адметнай рысай творчасці Ц. Гартнага з'яўляецца дэталёвая распрацоўка тэмы Першай сусветнай вайны, рэалізаванай то асобна («Уцекачы»), то (у пераважнай большасці выпадкаў) інклюзіўна, у повязях з разглядам іншых актуальных праблем адлюстраванага гістарычнага часу («Загадзе», «На руінах», «Чырвонаармеец Панкел Ліпа», «Чарговы запіс», «Сокі цаліны»). Дадзеная тэма ўваходзіла ў камплементарны дыялог з іншымі: перш за ўсё, рэвалюцыйнай тэматыкай (аўтар звяртаўся да падзей 1905 і 1917 гг.). Ц. Гартны разглядаў уплыў Першай сусветнай на жыццё ў Беларусі, малюючы некалькі груп персанажаў: ад сялян да працаўнікоў фабрык і заводаў, ад афіцэрства да шараговай салдацкай масы. Гэтая адметнасць дазваляла падкрэсліць сапраўды глабальны маштаб перажытага. Агульны вопыт радыкальным чынам змяніў светапогляд самога аўтара, а не толькі яго герояў. У сюжэтным плане проза Ц. Гартнага вылучаецца малюнкамі канцэптуальна значных момантаў: мабілізацыя, эскалацыя ўзброенага канфлікту, сыход масаў народа ў бежанства, выспяванне ідэі класавай барацьбы на прасторах Расійскай імперыі.

Выразны матыў вайны-працы ў рамане «Сокі цаліны» звязаны з думкай пра татальны характар навалы-кантынуума. Аўтар падкрэсліваў усеагульнасць яе праяў: ад дзейнасці франтавога канвеера да наканаванага цывільнаму насельніцтву бежанства з усімі яго этапамі, а таксама разрастання шпітальнай прасторы. Ц. Гартны заўважыў, што вайна-праца канчаткова перанесла акцэнты са стваральнага на пякельнае і вынішчальнае. Працаўнік любога кшталту ператвараўся ў салдата: вылучаліся ўласна вайсковец, што трываў на фронце, і рабочы, які «змагаўся» на фабрыцы ў тыле. Празаік падкрэсліваў, што селянін-бежанец ператвараўся ў маргінала, адарванага не толькі ад гаспадаркі з яе штодзённымі патрэбамі, але і ад спрадвечнага жыццёвага ладу. Падобныя героі радзей атаясамлівалі вайну з працай, хутчэй адносячы ўзброены канфлікт да шэрагу стыхійных бедстваў.

ЛІТАРАТУРА

1. Жылуновіч, З. Беларуская літаратура і 10 год кастрычнікавае рэвалюцыі / З. Жылуновіч // Полымя. – 1927. – № 7. – С. 196 – 206.
2. Ф-ко, Ю. Згукі сусьветнай вайны 1914 – 1918 году у Беларускай паэзіі / Ю. Ф-ко // Школа и культура советской Белоруссии. – 1919. – № 1. – С. 1 – 12.
3. Гарэцкі, М. Беларуская літаратура пасьля «Нашае Нівы» / М. Гарэцкі // Маладняк. – 1928. – № 4. – С. 76 – 97.
4. Жылуновіч, З. Беларускі Парнас у новай вопратцы (Абегла-крытычны нарыс) / З. Жылуновіч // Полымя. – 1923. – № 2. – С. 68 – 85.
5. Гартны, Ц. Уцякачы / Ц. Гартны // Дзянніца. – 1916. – № 1. – С. 2 – 3.
6. Чырвань, Я. Загадзе / Я. Чырвань // Савецкая Беларусь. – 1920. – № 10. – С. 2 – 3.
7. Гартны, Ц. Чырвонаармеец Панкел Ліпа / Ц. Гартны // Ц. Гартны. Выбраныя творы. – Мінск : Беларуская навука, 2012. – С. 476 – 505.
8. Гартны, Ц. На руінах / Ц. Гартны // Полымя. – 1923. – № 2. – С. 6 – 28.
9. Гартны, Ц. Чарговы запіс (Дзённік-нататкі Антона Дзежкі) / Ц. Гартны // Маладняк. – 1931. – № 10. – С. 39 – 90.
10. Андраюк, С. Яго трагічны лёс / С. Андраюк // Ц. Гартны. Выбраныя творы. – Мінск : Беларуская навука, 2012. – С. 5 – 22.
11. Александровіч, С. Цішка Гартны / С. Александровіч // Ц. Гартны. Збор твораў: у 4 т. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1987. – Т.1: Вершы, 1909 – 1935. Апавяданні, 1909 – 1927. – С. 6 – 26.

12. Александровіч, С. Цішка Гартны / С. Александровіч // Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: у 2 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1965. – Т.1. 1917 – 1941. – С. 256 – 279.
13. Дасаева, Т. Цішка Гартны / Т. Дасаева // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – Т. 1. 1901 – 1920. – С. 358 – 380.
14. Гартны, Ц. Сокі цаліны / Ц. Гартны // Збор твораў: у 4 т. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – Т.3: Раман. – С. 5 – 506.

Прозвішча, імя і імя па бацьку: Траццяк Зоя Іванаўна
Месца працы: Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай, кафедра сусветнай літаратуры і замежных моў
Пасада: прафесар
Вучоная ступень, званне: доктар філалагічных навук, дацэнт
Хатні адрас: 211 413 Віцебская вобласць, г. Полацк, вул. Зыгіна, д.65, кв. 64
Тэлефон: +375 29 104 62 72
Пашпартныя звесткі: ВМ 1781186, 4231284ЕО22РВО, 02.02.2010, Полацкі ГАУС Віцебскай вобласці, 211 413 Віцебская вобласць, г. Полацк, вул. Зыгіна, д.65, кв. 64